школьников в историко-краеведческом музее / Т.В. Чумалова // Воспитание подрастающего поколения в музее: теория, методика, практика. — М., 1989. — С. 30—42. — (Сб. науч. тр. / НИИ культуры).

**В.І. Вярбіцкая (Мінск)**

# ІНВЕРСІЯ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНАГА МУЗЕЯ ЯКУБА КОЛАСА

На мяжы стагоддзяў адбыліся значныя змены ў сацыякультурным жыцці нашай краіны, якія абумовілі фарміраванне новых поглядаў на ролю і месца ўстаноў культуры ў грамадстве, у тым ліку і музеяў. Яны пачалі актыўна ўключацца ў сацыякультурныя працэсы, а не з'яўляцца толькі пасіўнымі транслятарамі культурнага вопыту народа.

Агульныя тэндэнцыі сучасных музеяў свету сведчаць аб інверсіі іх форм дзейнасці, якія спалучаюць музейнасць, тэатральнасць, канцэртнасць і накіраваны не толькі на асветніцкія, выхаваўчыя, але і рэкрэацыйна-забаўляльныя запатрабаванні асобы. Гэта ў поўнай меры тычыцца і літаратурных музеяў нашай краіны, сярод якіх сваёй адметнасцю вылучаецца літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, заснаваны ў 1956 годзе. Яго фонды налічваюць каля 30 тысяч адзінак. Музей мае 10 экспазіцыйных залаў, у дзвюх з каторых захаваны інтэр'ер пакояў хаты Якуба Коласа ў нязменным выглядзе з дня смерці паэта. Профіль, спецыфіка названага музея абумоўліваюць адметнасць форм яго дзейнасці.

Асноўнай формай работы музея Якуба Коласа з'яўляецца (і, напэўна, будзе заўсёды) экскурсія. Неабходна адзначыць, што экскурсіі па літаратурных экспазіцыях валодаюць характэрнымі толькі для іх якасцямі. Дамінуючае месца ў іх займаюць тэмы жыцця і творчасці пісьменніка. На сённяшні дзень праблема экспантуры вельмі востра стаіць перад супрацоўнікамі музея. Справа ў тым, што ў наведвальнікаў літаратурных музеяў склалася трывалае меркаванне аб экспазіцыі як суцэльных дакументальных помніках

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(кнігі, газеты, рукапісы і т. д., фотаздымкі). Адносіны да гэтага хутчэй адмоўныя, чым станоўчыя. Аднатыпнасць экспантуры ў хуткім часе перастае прываблiваць увагу, надакучвае, здаецца сумнай. Наступае момант, калі наведвальніка ўжо не ўражвае арыгінальны аўтограф пісьменніка сярод мноства навуковых копій і звычайных ксеракопій. Такі стан рэчаў не толькі не спрыяе, а робіць немагчымым эфект «суаўтарства», які ўзнікае, як правіла, пры знаёмстве з рукапісамі паэта, калі наведвальнік быццам бы далучаецца да творчага працэсу. Таму перад экскурсаводамі літаратурнага музея Якуба Коласа паўстала задача надаць экскурсіі адпаведную пачуццёвую, вобразную афарбоўку. Намаганні супрацоўнікаў музея скіраваны на якасны падбор прадметнага раду экспантуры. Тым больш што музей Якуба Коласа, з'яўляючыся літаратурна-мемарыяльным, прадстаўляе такую магчымасць. Ён размешчаны ў будынку, дзе пэўны час жыў пісьменнік, што дазволіла супрацоўнікам музея ўкамплектаваць фонды матэрыяльна-рэчавымі прадметамі: асабістымі рэчамі паэта, прадметамі інтэр'ера, творамі жывапісу і г. д. Адметнасцю музея Якуба Коласа з'яўляецца і стварэнне яго філіялаў у Стаўбцоўскім раёне. У 80-х — 90-х гадах мінулага стагоддзя мемарыяльныя сядзібы адчынены ў Альбуці, Акіньчыцах, Ластку, яшчэ раней — у Смольні. Зараз вядзецца праца па музеефікацыі мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю Якуба Коласа ў Пухавіцкім раёне і Пінску. Усё гэта дазваляе супрацоўнікам музея ўзбагаціць дакументальна-фатаграфічную частку экспазіцыі рэчавымі экспанатамі і тым самым надаць экскурсіі разнастайнасць літаратурнай часткі.

Эфект суаўтарства ў многім залежыць ад форм, метадаў і сродкаў арганізацыі і падрыхтоўкі экскурсіі. Супрацоўнікі музея Якуба Коласа імкнуцца творча, індывідуальна, дыферэнцыравана падыходзіць да экскурсійнай дзейнасці, улічваць розныя катэгорыі наведвальнікаў, іх інтарэсы, веды, псіхалагічныя, фізіялагічныя і іншыя асаблівасці. Па тэматыцы літаратурныя экскурсіі дзеляцца на гісторыка-літаратурныя і літаратурна-манаграфічныя, падчас якіх адбываецца знаёмства з жыццём і творчасцю Якуба Коласа і з гісторыяй літаратуры, яе этапамі, накірункамі развіцця і роляй паэта ў гэтым гістарычным працэсе. Супрацоўнікі музея імкнуцца адабраць самыя ўнікальныя, атрактыўныя экспанаты, якія дапамагаюць стварыць аб'ектыўны вобраз літаратара. Вельмі важна да экспанатнага раду дапасаваць маршрут. Аналіз экскурсійнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзейнасці супрацоўнікаў музея Якуба Коласа паказвае, што галоўнымі патрабаваннямі да маршрута з'яўляюцца зручнасць, лёгкасць у прасоўванні наперад, пазбаўленнасць «петляў», што, як паказвае практыка мінскіх літаратурных музеяў, не заўсёды і ўсюды выконваецца. Маршрут складаецца такім чынам, каб пры паслядоўным паказе аб'ектаў магчыма было не толькі прадэманстраваць усе намечаныя падтэмы экскурсіі, але і мэтанакіравана, прыгожа падаць змест. Супрацоўнікі музея практычна адмовіліся ад крытыка-хрэстаматыйнай пабудовы экскурсіі, якая ў нейкай ступені агучвае школьны падручнік, падпарадкоўваючы яго зместу. У музеі створаны новыя экспазіцыі, дзе пераважае музейная мова вобразаў, сімвалаў, узнімаючыся над сумнай і нецікавай ілюстрацыяй школьнай «крытыкі». У экскурсійную дзейнасць усё смялей уваходзяць дыялагічныя экскурсіі, калі паміж экскурсаводам і экскурсантамі адбываецца абмен пытаннямі і адказамі. Гэта дазваляе актывізаваць аўдыторыю, устанавіць жывую зваротную сувязь, адчуць настрой, запатрабаванні, інтарэсы наведвальнікаў, абраць больш эфектыўную методыку правядзення экскурсіі.

Значная ўвага надаецца ў музеі Якуба Коласа пашырэнню форм экскурсій і ўдасканаленню методыкі іх правядзення. Сёння ў музеі праводзяцца аглядныя (шматпланавыя), тэматычныя (аднатэмныя) і цыклавыя экскурсіі. З дапамогай агляднай экскурсіі магчыма не толькі ў сціслым, абагульненым выглядзе раскрыць пэўную тэму, але і пазнаёміць наведвальнікаў з найбольш значнымі калекцыямі, гісторыяй музея. Падчас тэматычнай экскурсіі адбываецца шырокае, усебаковае раскрыццё тэмы з улікам розных катэгорый наведвальнікаў. Экскурсаводы музея імкнуцца абудзіць цікавасць, сфарміраваць творчы падыход, зарыентаваць наведвальніка, а не падаць яму гатовую, некім складзеную і перапрацаваную інфармацыю. Супрацоўнікі музея практычна адмовіліся ад крытыка-хрэстаматыйнага падыходу да выбару тэм, адаптаваных да школьнай альбо студэнцкай вучэбных праграм, вядзецца праца па пашырэнні аўдыторыі тэматычных экскурсій, наладжванні супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых узроставых і сацыяльна-прафесійных катэгорый наведвальнікаў. Інавацыяй у экскурсійнай дзейнасці супрацоўнікаў музея з'яўляецца работа па групаванню пэўнай колькасці тэматычных экскурсій у цыкл, што прадстаўляе магчымасць глыбейшага вывучэння большай колькасці помнікаў. Неабходна адзначыць, што цыкл экскурсій — гэта не проста пэўная сума тэм, а сукупнасць узаемазвязаных экскурсій, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асноўныя тэмы, пытанні, праблемы праходзяць чырвонай ніткай праз увесь экскурсійны цыкл.

У практыку экскурсійнай дзейнасці музея Якуба Коласа ўвайшла такая форма як музейная лекцыя. Яе асноўнай адметнасцю з'яўляецца ўключэнне ў яе змест музейных прадметаў і іх дэманстрацыя. Гэта тлумачыцца спецыфікай музейных прадметаў, якія маюць бінарную сутнасць. З аднаго боку — гэта чыста візуальная інфармацыя аб прадмеце. З другога — гэта сімвал, калі музейны прадмет не ўспрымаецца толькі як рэч, а выступае крыніцай культурнай і гістарычнай інфармацыі, медыятарам паміж сучаснікамі і мінулымі пакаленнямі. Лекцыі супрацоўнікі мемарыяльнага музея, як правіла, праводзяць у яго будынку, таму што музейнае асяроддзе з'яўляецца эфектыўным фактарам эмацыянальнага, вобразнага ўздзеяння на аўдыторыю.

Напрыканцы XX ст. у літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа пачалі пранікаць нетрадыцыйныя формы дзейнасці з наведвальнікамі: арганізацыя тэатральна-музычных відовішчаў, літаратурных вечарын, розных свят, канферэнцый, сустрэч. Так, з 1985 года музей штогод ладзіць літаратурнае свята і навуковую канферэнцыю «Каласавіны». У свяце прымаюць удзел вядомыя літаратуразнаўцы, лінгвісты, гісторыкі, мастацтвазнаўцы, філосафы. У час «Каласавін» арганізоўваюцца кніжныя кірмашы, выставы-продажы твораў народных майстроў. У Стаўбцоўскім раёне супрацоўнікі музея сумесна з аддзелам культуры райвыканкома праводзяць раённы агляд мастацкай самадзейнасці творчых калектываў «Красуй, Беларусь», дзіцячае свята «Альбуцкая крынічка», рэспубліканскі фестываль юных музыкаў «Сымон-музыка». Названыя і іншыя нетрадыцыйныя мерапрыемствы накіраваны не толькі на рашэнне адукацыйных, асветніцкіх, выхаваўчых задач, але і на забеспячэнне рэкрэацыйна-забаўляльных патрэбнасцей наведвальніка. Спалучэнне пазнавальна-інфармацыйнага матэрыялу з элементамі відовішча і тэатралізацыі задавальняе наведвальніка, які з ахвотай прысвячае музею частку свайго вольнага часу.

*Літаратура і крыніцы*

1. Воронин, А.А. Музеи как креативное пространство культуры / А.А. Воронин // Философ. Исследования. — 1994. — № 1. — С. 69 — 84.
2. Гнедовский, М.Б. Музейная аудитория / М.Б. Гнедовский // Советский музей. — 1986. — № 4. — С. 38—41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Зайцава, Г.І. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ў Мінску / Г.І. Зайцава // Роднае слова. — 2002. — № 2. — С. 99—100.
4. Камароўская, З.М. Літаратурны музей Якуба Коласа / З.М. Камароўская. — Мн.: Полымя, 1989. — 14 с.
5. Пратасевіч, М.І. Літаратурны музей Якуба Коласа / М.І. Пратасевіч. — Мн.: Полымя, 1981. — 43 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ